## Вогненныя вёскі Асіповіцкага раёна.

Родная глеба,
Кожнае зерне
углядаецца ў неба.
П.Броўка.

У жыцці людзей нішто так не пакідае незабыўны след, як гора. Вялікае, неабдымнае гора. Колькі яго прыйшло ў наш край разам з шалёнымі бандамі фашыстаў у 1941 годзе. Кожны дзень і кожную гадзіну яно стукала ў дзверы. У гісторыі войнаў яшчэ не было такой канцэнтрацыі злачынстваў і варварства, такіх жахлівых злачынстваў, якія чынілі захопнікі на беларускай зямлі ў час Вялікай Айчыннай вайны. Яны вялі вайну перш за ўсё з мірным і бяззбройным насельніцтвам, з жанчынамі, дзецьмі і старымі. З уласцівай ім звярынай, садысцкай жорсткасцю гітлераўцы знішчалі савецкіх людзей, яны імкнуліся сцерці з твару зямлі ўсё жывое, разбурыць, знішчыць тое, што стварыў наш народ на працягу стагоддзяў. Характэрнай асаблівасцю палітыкі «выпаленай зямлі» стала знішчэнне населеных пунктаў разам з жыхарамі. Тысячы вёсак змяталіся з твару зямлі, насельніцтва знішчалася, уганялася ў лагеры смерці і ў фашысцкае рабства ў Германію, маёмасць падвяргалася рабунку. Час згладжвае ў памяці нязначныя падзеі, залечвае невялікія раны, прытупляе боль. Але ёсць і такія падзеі, такія раны і такі боль, якія непадуладны часу. Адной з такіх трагічных падзей часоў Вялікай Айчыннай вайны з’явілася знішчэнне вёсак разам з іх жыхарамі.

У Беларусі з агульнай колькасці 9200 пасёлкаў і вёсак, разбураных і спаленых гітлераўцамі, звыш 5295 нацысцкія злачынцы знішчылі разам з усім ці часткай насельніцтва ў перыяд карных аперацый.

Аб масштабах знішчэння фашысцкімі захопнікамі населеных пунктаў Беларусі разам з людзьмі гавораць наступныя даныя: колькасць знішчаных вёсак разам з жыхарамі: неадроджаныя — больш за 185, адроджаных больш за 440.

Колькасць знішчаныя вёсак з часткай жыхароў. неадноўленых — 325, аднoўленых — больш за 4340.

У Асіповіцкім раёне знішчана цалкам або часткова звыш 50 вёсак і больш за 5 тысяч чалавек.

## Вёскі, знішчаныя разам з жыхарамі і не аднoўленыя пасля вайны.

### Бортнае

Колішняя вёска Карытнянскага сельскага Савета, знаходзілася за 10 км ад чыгуначнай станцыі Дараганава, на лініі Асіповічы-Старыя Дарогі, за 1 км ад вёскі Мяжное. У даўнія часы, апрача земляробства і жывёлагадоўлі,

мясцовыя жыхары займаліся бортным промыслам (пчалярствам). Таму пасяленне і атрымала сваю назву. На пачатку XX ст. засценак Бортнае — у Бабруйскім павеце. 13 двароў, 102 жыхары. Паводле перапісу насельніцтва 1917 г. — 13 двароў, 73 жыхары. У 1926 г. в. Бортнае мела 18 гаспадарак і 104 жыхары. На 1940 год у вёсцы 17 двароў, 86 жыхароў. У студзені 1943 года сяло было абрабавана і знішчана нямецка-фашысцкімі захопнікамі разам з 86-ю жыхарамі. "Прыгожая была наша вёска Бортнае, — успамінае Міхаіл Катарскі, сведка той пары. — У ёй прайшло маё дзяцінства, надыходзілі гады юнацтва. Але раптам студзенскай раніцай 1943 года сяло акружылі немцы. Старых, жанчын, дзяцей пачалі зганяць у хату майго дзядзькі. Мяне таксама загналі туды. Але са сваім сябрам, Альфрэдам Вольскім, мы ўцяклі праз акно і, схаваўшыся, бачылі, што адбываецца далей. Да хаты з людзьмі немцы паднеслі 4 каністры з бензінам, а ў вокны паставілі 4 кулямёты, каб ніхто не выскачыў, затым падпалілі. А пасля запалымнела ўся вёска. І не стала ні вёскі, ні яе жыхароў".

У 1967 годзе на месцы спаленай вёскі ўстанавілі помнік. Вёска Бортнае ўвекавечана ў мемарыяльным комплексе "Хатынь".

**Весялова**

Колішняя вёска Лапіцкага сельсавета, якая знаходзіцца на паўночны ўсход ад вёскі Лочын, за 9 км ад чыгуначнай станцыі Уборак на лініі Градзянка-Верайцы. Назва ўтворана ад наймення ўрочышча, дзе ўзнікла пасяленне. У 1940 годзе ў ім мелася 15 двароу і 72 жыхары. У студзені 1943 года нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі 29 сяльчан, у маі ў агні загінула яшчэ прыкладна столькі ж. Яна увекавечана ў мемарыяльным комплексе "Хатынь".

№139 Акт о сожжении немецкими оккупантами **д. Викторово** Осиповичского района и расправе с ее жителями.

13 мая 1944 г.

Мы, нижеподписавшиеся, политрук роты отряда имени тов. Сталина Трошко Яким Андреевич, партизаны Лещук Николай Петрович и Патуремский Федор Григорьевич, житель, оставшийся в деревне Викторово Погорельского с/с Осиповичского р-на, гр-н Ласицкий Анатолий Зенонович, составили настоящий акт о зверствах, учиненных 5 мая с.г. немецко-фашистскими захватчиками в дер. Викторово.

5 мая 1944 г. немецко-фашистские захватчики оцепили деревню, согнали весь народ босый и голый в одно место, больных стариков и старух расстреляли на месте, а остальных, трудоспособных, угнали на каторгу в Германию, а детей и нетрудоспособных угнали в лагеря смерти. Всего угнано и убито 98 человек. Со всей деревни осталось в живых всего лишь 2 человека. Всего в деревне сожжено 19 домов, т.е. деревня сожжена полностью вся.

Все имущество и продовольствие населения фашисты увезли с собой.

Для чего и был составлен настоящий акт. Акт подписали: Политрук роты отряда им. тов. Сталина Трошко Партизаны Лещук

Потуревский

Житель дер. Викторово Ласицкий

НАРБ. Ф. 1350. Оп. 1. Д. 161. Л. 68. Подлинник. Рукопись.

## Макаўе

Здесь село было такое — Маковье:
К дому дом — дома богатырей,
Славилось своими чудо-маками,
Торжествами в праздник Маковей.

Колішняя вёска былога Пагарэльскага сельсавета. Знаходзілася за 10 км ад вёскі Лазовае, за 7 км ад чыгуначнай станцыі Градзянка на лініі Градзянка- Верайцы. На пачатку XX стагоддзя Макаўе уяўляла сабой засценак Пагарэльскай воласці Ігуменскага павета. Тут мелася 7 гаспадарак і 40 жыхароў. У 1916 годзе — 16 двароў, 93 жыхары. У пачатку 1930-х праведзена калектывізацыя. На 1940 год налічвалася 48 двароў і 248 жыхароў. 8 студзеня карнікі загубілі больш за 225 чалавек з Макаўя, а таксама каля паўсотні з іншых вёсак.

Макаўе ўвекавечана ў мемарыяльным комплексе “Хатынь”. На месцы спаленай вёскі пастаўлены помнік.




З успамінау Галіны Паўланы Гурэнчык, 1935 года нараджэння з горада Ільічоўска Адэскай вобласці:

— Макаўе знішчылі на Каляды за сувязь з партызанамі. Уся вёска была лясная — знаходзілася зусім побач з лесам. А наша хата стаяла самай крайняй, таму частымі гасцямі былі ў нас партызаны. Добра помню: чужы чалавек зойдзе ў хату — бацькі пашэпчуцца. . . Ён рукзак праз плечы — хлеба яму пакладуць, яшчэ нечага. .. Лес каля хаты —

літаральна за метраў 30. Бацька быў партызанскім сувязным. У нашай сям'і было чацвёра дзяцей. І дзякуй богу, усе ў той дзень засталіся жывыя, бо схаваліся ў лесе: партызаны паведамілі, што ідзе карны атрад і збіраецца спаліць Макаўе. Разам з намі яшчэ некалькі сямей выехала. Немцы прыйшлі ў маскіровачных халатах, сагналі ўсіх у недабудаваны зруб. Аблілі бензінам і падпалілі. Усе хаты згарэлі. Жудасна было глядзець на папялішча. Тыя, хто ўцалеў, напачатку хацелі паставіць новыя хаты, але не змаглі. Так і знікла наша вёска…

**Старонка**

Вёска Карытнянскага сельсавета. Знаходзіцца за 4 км ад вёскі Старое Сяло, за 18 км ад чыгуначнай станцыі Ясенъ на лініі Асіповічы-Бабруйск.

Паводле перапісу 1926 г было 24 двары і 114 жыхароу. На 1940 год — 36 двароў і 168 жыхароў.

У жніўні 1943 года немцы абрабавалі, спалілі Старонку, частку людзей адправілі у Германію, чалавек 100 спалілі.

Увекавечана ў мемарыяльным комплексе "Хатынь".

## Вёскі, знішчаныя разам жыхарамі і адноўленыя пасля вайны.

**Лочын**

Вёска Лапіцкага сельсавета. За 5 км ад чыгуначнай станцыі Уборак на лініі Градзянка-Верайцы, на беразе возера Лочынскае.

У 1940 годзе 77 двароў і 536 жыхароў.

Да вайны тут жыло каля 500 чалавек. Вёска нічым не адрознівалася ад іншых. Як і зараз, атуленая лесам, стаяла ўдалечыні ад вялікіх дарог. Мірнае жыццё было парушана з пачаткам фашысцкай акупацыі. Цяжка прыйшлося лочынцам. Многія мужчыны пайшлі ў партызаны. Жанчыны з дзецьмі жылі то ў вёсцы, то ў лесе, дзе пабудавалі зямлянкі. Але не ўдалося ім дачакацца перамогі: адных расстралялі на Каляды ў сорак другім годзе, другія сталі ахвярамі фрыцаў ў маі сорак чацвёртага. Усяго, па дадзеных Нацыянальнага архіва, тут загінула 736 чалавек, у ліку знішчаных 300 з іншых населеных пунктаў.

З успамінаў ураджэнца вёскі Юрыя Канстанцінавіча Кедзіча:

- Нашу вёску палілі некалькі разоў.

№ 138 Акт о сожжении немецкими оккупантами д. Лочин Осиповичского района и ее жителей 13 мая 1944 г.

Мы, нижеподписавшиеся, политрук роты отряда им. Сталина Трошко Яким Андреевич, партизаны Лещук Николай Петрович и Патуремский Федор Григорьевич, жители дер. Лочин Погорельского с/с Осиповичского р-на гр-

не Мозолевский Виктор Алексеевич и Берниковский Адам Антонович, составили настоящий акт о зверствах, учиненных 7 мая с.г. немецко-фашистскими захватчиками в дер. Лочин.

7 мая 1944 г. немецко-фашистские захватчики оцепили деревню, согнали всех жителей деревни в 4 дома и в бани, избивали их, а после чего забили наглухо окна и двери и зажгли дома с живыми жителями. Стон и крик стал слышен за 4-5 км. Здесь погибло и варварски замучено 232 чел. в деревне. Из них стариков от 50 до 70 год - 31 человек, детей от 1 до 6 год - 11 человек, детей от 6 до 14 год - 32 человека. Так варварски замучил и сжег немецкий фашизм ничем невинное мирное население дер. Лочин Погорельского с/с.

Все имущество и продовольствие населения фашисты увезли с собой. Всего в деревне сожжено 48 домов.

Для чего и был составлен настоящий акт. Акт подписали: Политрук роты отряда им. тов. Сталина Трошко

Партизаны Лещук

Потуревский

Жители дер. Лочин Мозолевский Виктор

Верениковский

Тут у 1976 годзе ўстаноўлены помнік загінуўшым. У 2023 з’явіўся яшчэ адзін абеліск.

**Асавок**

Вёска у Градзянскім сельсавеце, раней — у Каменіцкім.

Да вайны тут у 53 дварах жыло каля 300 чалавек.

Упершыню фашысты з'явіліся у вёсцы летам 1942 года - абрабавалі некалькі сем'яў. Пазней наведваліся пару разоў свіслацкія паліцэйскія, але, баючыся партызан, хутка знікалі. Затое апошнія былі частымі гасцямі. Некаторы час яны нават жылі ў хатах вяскоўцаў. Адсюль хадзілі на баявыя заданні. Так было і ў ноч з 31 снежня на 1 студзеня. Тады народныя мсціўцы знішчылі цягнік з 345 фашысцкімі лётчыкамі, якія накіроўваліся на сталінградскі фронт у армію Паўлюса. У баі страцілі Васю Лапінскага і Лёню Максімава. Пасля вяртання ў вёску ад ран памерлі Мяфодзій Цвяцінскі, Максім Кошалеў і медсястра Надзя Ерка. Яны былі пахаваны на ўскрайку вёскі, але, на жаль, сёння пра тую магілку ўжо ніхто не ведае.

Пайшлі з жыцця тыя, хто змог бы паказаць месца пахавання. Хаця напачатку 90-х гэта яшчэ можна было зрабіць. Думаецца, што каменіцкія школьнікі проста не ведалі пра гэты факт. Займуцца адпаведнай пошукавай работай зараз, каб можна было аддаць даніну павагі партызанам. Тым больш што патрыятычнаму выхаванню ў Каменічах заўсёды надавалася значная ўвага. Дзякуючы ўсяму калектыву і мясцоваму сельсавету была праведзена падрыхтоўчая работа па ўшанаванні памяці мірных грамадзян, якія загінулі ў Асаўку ў калядныя дні сорак трэцяга. І ў 2005 годзе на месцы іх знішчэння ўзнік новы мемарыял з плітамі, на якіх указаны імёны 267 ахвяр фашызму. Захаваўся і ранейшы абеліск.



**З успамінаў Нэлі Вацлаваўны Новік (Шпілеўскай):**

-Гітлераўцы ўрываліся ў хаты і прыкладамі выганялі людзей на вуліцу. Прымушалі бегчы ў бок калгаснага гумна. Па ўсёй вёсцы чуўся лямант і плач. Салдатам не падабалася, што людзі так крычаць. Ад гэтага яшчэ больш вар'яцелі.

Наша хата стаяла пасярод вёскі. Уварваліся некалькі немцаў, выгналі ўсіх на двор. Дзеда Мечыслава, якому было ўжо 82 гады, прыстрэлілі каля ганка хаты. Мне з сястрой, бацьку і маці загадалі рухацца разам з усімі. Адтуль родныя вярнуцца ўжо не змаглі...

**З успамінаў Дрывіцкай (Шпілеўскай) Ядзвігі Вацлаваўны:**

- Жыхароў вёскі сагналі ў адно месца. Потым загналі ўсіх ў хату. У гэтай хаце і пераначавалі. Ранкам выводзілі па аднаму маладых мужчын, вялі ў варыўню і расстрэльвалі. Каля сенцаў стаяў немец з кулямётам, а другі выводзіў. Потым расстрэльвалі старыкоў.



Нэлі і Ядвіга Шпілеўскія засталіся жывыя толькі таму, што іх прымусілі гнаць вясковы статак на бліжэйшую станцыю, каб адправіць у фатэрлянд. Па дарозе ім удалося уцячы. Калі вярнуліся, убачылі страшную карціну... з папялішча ішоў дым і дыміліся косці. У той дзень 8 студзеня немцы паехалі на Градзянку і ў лесе заўважылі ўцёкшых асаўчан. Яны акружылі людзей, прывялі ў Асавок, загналі ў хату і спалілі жывымі.

**Успамінае Жывіца Вячаслаў Іосіфавіч, былы жыхар вёскі Асавок.**

- У той халодны студзеньскі дзень усіх жыхароў сагналі ў адно месца. Немцы спыталіся, хто пагоніць кароў у вёску Маліна ўка. Згадзіліся чатыры хлопцы, сярод якіх быў і я. Я быў самы малодшы. Калі загналі кароў за вёску, то кінулі іх, а самі схаваліся ў лесе. Нацягалі яловых лапак і схаваліся пад вялікай ёлкай. Было вельмі холадна, быў вялікі мароз. Так і пераначавалі.

Раніцай пайшлі па лесе, куды ішлі – не ведалі самі. У лесе сустрэлі нейкіх людзей, магчыма гэта былі партызаны. Двое старэйшых хлопцаў пайшлі з імі. Далейшы іх лес мне невядомы. Нас засталося двое: я і вясковы хлопец Гіліцкі Кароль. Паблукаўшы яшчэ нейкі час, мы вырашылі вярнуцца ў вёску. Калі прыйшлі ў Асавок – убачылі жудасную карціну. На тым месцы, куды былі сагнаны людзі, усё дымілася, было кругом шмат крыві. Непадалеку я знайшоў рукаў ад сукенкі. Па гэтым рукаве я пазнаў сукенку маёй малодшай сястрычкі. Я зразумеў, згарэлі ўсе: мама, брат і дзве сястры.



**Мемарыял на месцы спальвання жыхароў вёскі.**

**Асавок, блакада-43**

Вёска з цёплай назвай Асавок,
Партызаны тут у лесе дзесьці.
Вёска —партызанскі астровок —
Адпачыць, пагрэцца, штосьці з'есці.
Студзіць студзень холадам, зіма—
Маразы, завеі і сумёты.
Толькі партызанам сну няма,
Бо вакол блакада, куляміты.
Спешна з цёплай вёскі адышлі,
Нават хлеб пакінулі ў печах.
Зараз жа навалай напаўзлі
Людаеды з роду чалавечых.
Дзвесце дваццаць дзевяць чалавек —
Асавок увесь, хто быў у хатах,
Выгналі, заперлі ў хляве,
Падпалілі гітлераўцы-каты.
Двесце дваццаць дзевяць. Тут усе -
І бацькі, і дзеці і старыя.
Смерць не выбірала па чарзе,
Чорны попел разам іх накрые.
Мірныя сяляне назаўжды
Засталіся тут, дзе зараз помнік.
Лес замшэлы побач праз гады
Тое пекла не забудзе, помніць.
Бачылі нябёсы і сам Бог
Нашы вёскі ў роспачы, у скрусе.
Дык чаму ж ніхто не дапамог
Шматпакутным вёскам Беларусі?

Шчыміць сэрца. Родны Асавок.
Дык ці ж ён такі ўсяго адзіны?
Чорны, абгарэлы вугалёк
На далонях матухны-Радзімы.

Уладзімір Рачкоўскі, в. Рафалін, 2018 г.

**Брыцалавічы**

Вёска ў Ліпеньскім сельсавеце за 3 км ад чыгуначнай станцыі Брыцалавічы на лініі Асіповічы – Магілёў на рацэ Свіслач. У 1926 годзе 117 двароў, 590 жыхароу., у 1940 — 144 двары, 753 жыхары.

13 студзеня 1943 года ўсіх жыхароў фашысты сагналі ў адзін хлеў і падпалілі яго. Усяго расстраляна і спалена жывымі было каля 900 чалавек. Карнікі забралі ўсю жывёлу, а вёску спалілі цалкам. Некаторым сяльчанам усё ж такі ўдалося выратавацца.

З успамінаў Аляксея Фёдаравіча Патапейкі:

— Мяне, чатырнаццацігадовага хлапчука, таксама фрыцы прыгналі ў калгасны хлеў. Дзверы яшчэ не былі зачынены. Сястра маёй маці Ніна і цётка Алеся прашапталі: «Алёшка, давай уцякаць”. У суседніх хлявах чуліся ўжо стрэлы. Мы выбеглі ў адкрытае поле. Бегчы было цяжка, правальваўся снег, ногі знямелі. Нас заўважылі карнікі. Кулі свісталі вакол, а я ўсё бег... Азірнуўся, бачу, Ніна ўпала, цётка Алеся застыла на снезе... Да лесу далёка, а ўслед немцы бягуць. Тут якраз стог сена. Я пад стажарышча зашыўся. А вечарам быў у партызан.




У студзені 1971 года тут усталяваны помнік. Аўтары скульптуры: М.Андрэеў, А. Сяліцкі.

**Бозак**

Вёска ў Ліпеньскім сельсавеце. За 8 км ад чыгуначнай станцыі Градзянка на лініі Асіповічы – Градзянка на рацэ Батча.

На 1940 год налічвалася 103 двары, 521 жыхар.

У гады вайны тут дзейнічала падпольная група. Часта наведваліся партызаны, многія вяскоўцы дапамагалі ім. Фашысты не пашкадавалі мясцовых жыхароў і здзейснілі сваю чорную справу — спалілі. Трагедыя адбылася 9-10 мая 1944 года.

Тут былі  не толькі бозкаўцы, але і жыхары з навакольных вёсак, часткова з Лазовага, Вязычына і інш.

Пашчасліваіла выратавацца нямногім, у тым ліку Дзмітрыю Ціханавічу Гоціну, Сяргею Чыгілейчуку, Мікалаю Купрэйчыку, Піліпу Фёдаравічу Кожанцу. Некаторыя трапілі  ў канцлагер.

З успамінаў партызанскага сувязнога Мікалая Купрэйчыка:

- Як толькі карнікі  пасля чорнай справы выехалі за сяло, я прыбег да месца трагедыі. Наўкола — маўклівая цішыня. Толькі агонь дзе-нідзе яшчэ скакаў па сценах. выламаў дзверы... Там абгарэлыя людзі. Зайшлося сэрца. Пачаў крычаць, зваў бацьку, сына, але ніхто не адгукаўся. Хутка пазнаў родных...



У 1980 годзе пастаўлена скульптурная кампазіцыя «Бацькі» на брацкай магіле ахвяр фашызму: расстраляны і спалены мірныя жыхары і 10 воінаў і партызан. Скульптурная група ўяўляе сабой мужчыну, які трымае ў руках плуг, і жанчыну з сярпом. А над імі памерлы дарослы чалавек.

**Вялікая Гарожа**

Вёска Вяззеўскага сельсавета, за 5 км ад чыгуначнай станцыі Брыцалавічы на лініі Асіповічы – Магілёў.

У 1940 годзе 118 двароў, 380 жыхароў.

13 студзеня 1943 года карнікі спалілі вёску і загубілі 270 жыхароў вёскі.

З успамінаў Марыі Альфяровіч (Цімінскай):

-Мне было 5 гадоў, калі ў родную вёску прыйшлі фашысты. Яны крычалі ”партызан” і аўтаматамі штурхалі ў двор маму, бацьку, бабулю, сятрычку Анютку. Раптам бацька крыкнуў: ”Уцякай, дачушка”. Я кінулася на вуліцу, праз суседні двор у поле. Потым схавалася ў хлеўчыку, пакуль стралялі. Калі стала ціха, вылезла, агледзелася. У двары ляжалі маці, бацька, бабуля. Вакол кроў на снезе. На сугробе ляжала Анютка у адной сукеначцы…”

У 1974 годзе на магіле ахвяр фашызму пастаўлены абеліск.

**Вярбілава**

Вёска ў Лпіцкімм сельсавеце за 1 км ад чыгуначнай станцыі Лапічы на лініі Верайцы-Градзянка. У 1940 годзе налічвалася 18 двароў, 90 жыхароў.

У студзені 1943 года гітлераўцы спалілі вёску і знішчылі 45 яе жыхароў.

**Градзянка**

Былы рабочы пасёлак. Чыгуначная станцыя на лініі Верайцы-Градзянка, за 30 км ад Асіповічаў. Зараз цэнтр Градзянкага сельсавета. Паводле перапісу 1917 г., 77 двароў, 394 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну ў пасёлку дзейнічала падпольная антыфашысцкая група, а ў навакольных лясах базіравалася 1-я Асіповіцкая партызанская брыгада. Гітлераўцы некалькі разоў палілі пасёлак. У студзені 1943 года знішчылі 3 двары, 8 мужчын, 30 жанчын і 44 дзяцей. У 1942 годзе былі расстраляны сотні яўрэяў. Да вайны яўрэі складалі больш за палову колькасці жыхароў - 150 чалавек. Немцы ўвайшлі ў Гродзянку 1 ліпеня 1941г. Неўзабаве пасля акупацыі немцы, рэалізуючы гітлераўскую праграму знішчэння яўрэяў, сагналі яўрэяў вёскі ў гета, арганізаванае ў вялікім па плошчы доме, які належаў раней мясцоваму яўрэю па прозвішчы Вінакур. Вакол дома ўзвялі агароджу. Яўрэяў пад страхам смерці абавязалі нашыць на спіне знакі ў выглядзе жоўтых зорак. Ім было забаронена выходзіць за абгароджаную тэрыторыю. Многія спадзяваліся, што неўзабаве іх адпусцяць. Зімой 1941—1942 года немцы падрыхтавалі вялізную яму на вясковых могілках. 4 сакавіка 1942 г. яўрэям схлусілі, што іх перамяшчаюць на захад, і што яны павінны забраць з сабой каштоўныя рэчы. Асуджаных людзей везлі на санях да ямы,

ставілі на краі і расстрэльвалі ва ўпор. Па захаваных няпоўных дадзеных, у Гродзянцы былі забітыя 119 яўрэяў. Няпоўны спіс забітых яўрэяў прыведзены ў кнізе “Памяць. Асіповіцкі раён». У Гродзянцы ўсталяваны помнік ахвярам фашызму.




**Гоманаўка**

Вёска у Лапіцкім сельсавеце, за 23 км ад Асіповічаў, за 7 км ад чыгуначай станцыі Лапічы.

У 1926 г. 37 двароў, 187 жыхароў.

У студзені 1943 года гітлераўцы спалілі вёску (49 двароў) і знішчылі 19 мірных жыхароў.

**Каменічы**

Вёска ў Градзянскім сельсавеце, за 28 км ад Асіповічаў, за 6 км ад чыгуначнай станцыі Градзянка.

У 1926 годзе 134 двары, 685 жыхароў.

У Вялікую Айчынную вайну фацысты тройчы спрабавалі спаліць вёску: у студзені 1943 года (7 двароў, 15 мужчын), лютым і маі 1944 года. Усяго загінулаа каля 30 мірных жыхароў.

**Лучыцы**

Вёска у Вяззеўскім сельсавеце, за 6 км ад Асіповічаў, за 2 км ад

чыгуначнай станцьй Асіповічы -3.

У 1940 годзе 96 двароў, 270 жыхароў.

У студзені 1943 года была спалена гітлераўцамі, забіта 8 жыхароў.

**Малая Гарожа**

Вёска у Вяззеўскім сельсавеце, за 7 км ад Асіповічаў, за 4 км ад чыгуначнай станцы Асіповічы -2.

У 1940 годзе 82 двары, 310 жыхароў.

У студзені 1943 года гітлераўцы спалілі 74 двары і забілі 3 жыхары.

**Мяжное**

Былая вёска ў Дараганаўскім сельсавеце, за 24 км ад Асіповічаў, за 12 км ад чыгуначнай станцыі Дараганава.

У 1940 годзе 60 двароў, 250 жыхароў.

У студзені 1943 года фашысты разграбілі, спалілілі вёску цалкам і загубілі яе жыхароў.

**Пагарэлае**

Вёска ў Лапіцкім сельсавеце, раней — у былым Пагарэльскім, за 5 км ад чыгуначнай станцыі Уборак на лініі Верайцы-Градзянка.

На 1940 г. налічвалася 129 двароў, 645 жыхароў.

У лютым 1942 года была першы раз абрабавана і спалена фашыстамі, якія загубілі 187 жыхароў, у студзені 1943 года спалілі 15 двароў і знішчылі 8 чалавек.

**Палядкі**

Былая вёска ў Пагарэльскім сельсавеце. Размяшчалася за 6 км ад чыгуначнай станцьй Уборак, на лініі Асіповічы – Уборак.

У 1926 г. пасёлак, 27 двароў, 106 жыхароў.

Да вайны тут стаяла 41 хата, жылі 159 чалавек. У маі 1944 года акупанты спалілі вёску разам з 79 жыхарамі. Пасля вайны была адноўлена. Не існуе з 1983 года. Аб трагедыі нагадвае помнік.

№ 137 Акт о сожжении немецкими оккупантами д. Полядки Осиповичского района и ее жителей 7 мая 1944 г.

1944 г., мая м-ца, 9 дня, мы, нижеподписавшиеся, комиссар партизанского отряда им. Ленина Баранов Н.В., начальник особого отдела п/о им. Ленина Татаркин Н.М. и партизан отряда Шишковец С. сего числа составили настоящий акт о произведенных зверствах фашистскими злодеями по д. Полядки Погорельского с/с Осиповичского р-на.

9 мая с.г. предпринятая фашистами экспедиция по борьбе с партизанами превратилась в наглое уничтожение мирных граждан, грабеж и разорение.

Находясь в д. Полядки, фашисты согнали находившихся там жителей в количестве 74 человека в два жилых дома. Продержав до позднего вечера зажгли данные с людьми постройки и подвергли обстрелу пытавшихся

вырваться из огня граждан, в результате было уничтожено 24 женщины и 48 детей.

О чем и составлен настоящий акт.

Акт составили

Комиссар партизанского отряда им. Ленина Баранов

Начальник особого отдела Татаркин Партизан Шишковец

**Ражышча 1, 2**

Вёска у Лапіцкім сельсавеце, за 25 км ад Асіповічаў, за 7 км ад чыгуначнай станцыі Лапічы.

У 1940 годзе 30 двароў, 130 жыхароў.

У студзені 1943 года карнікі спалілі вёску і знішчылі 50 чалавек.

**Цалянская Буда**

Былая вёска ў былым Пагарэльскім сельсавеце. Пазмяшчалася за 4 км ад чыгуначнай станцыі Лапічы. У 1926 годзе 17 двароў, 87 жыхароў. Перад Вялікай Айчыннай вайной – 23 двары, 115 жыхароў.

У студзені 1943 года была спалена фашыстамі. Загінулі 10 мужчын.

№116 Из приказа № 36 военно-оперативной группы при Осиповичском подпольном райкоме КП(б)Б о задачах партизан

7 ноября 1943 г.

[...] Фашистский зверь смертельно ранен, но раненый зверь безумен и кровожаден. Гитлеровские головорезы, бессильные отразить сокрушающие удары Красной Армии, изливают свою черную злобу на безоружных людей стариков, женщин и детей. Они разрушают и сжигают наши города и села, грабят, насилуют, угоняют в рабство и убивают наших престарелых отцов и матерей, наших юных братьев и сестер, наших малолетних детей.

Мы являемся живыми свидетелями дикого фашистского террора на территории Осиповичского района. За время своего бандитского правления гитлеровские головорезы расстреляли, повесили и сожгли до 5000 человек мирного населения нашего района. Особенно свирепствовали немцы в деревне Маковье, где ими расстреляно и замучено в один прием 175 человек, в деревне Трактор - 212 человек, в деревне Лочин - 82 человека, в деревне Брицаловичи - 432 человека, в деревне Большая Горожа - 400 человек и т.д.

Большинство сел нашего района сожжено и разграблено. Гитлеровцы сожгли такие деревни, как Погорелое, Лесное, Полядки, Бозок, Игнатовка, Химное, Орча, Маковье, Лочин, Гомановка, Брицаловичи, Горожа, Лучицы, Бортное, Межное, Старое Село и другие.

Население многих деревень лишено имущества и вынуждено находиться в лесу в тяжелых условиях.

Но никакими репрессиями, никаким террором фашисты не смогут сломить непреклонную волю к победе у свободолюбивого белорусского народа. Народ-богатырь никогда не станет рабом! Он расправил свои

могучие плечи и поднял оружие для того, чтобы истребить всех до одного фашистских грабителей и детоубийц, поганящих нашу священную землю.

Товарищи! В борьбе с немецкими оккупантами мы добились серьезных успехов. Враг на территории нашего района понес огромные потери. Мы оказали фронту большую помощь. Но успокаиваться на этом в тот момент, когда наша доблестная Красная Армия, ломая ожесточенное сопротивление врага, освобождает все новые и новые районы, было бы преступным. Родина требует от нас сейчас максимального напряжения сил.

В целях наиболее эффективной помощи Красной Армии в деле быстрейшего разгрома немецко-фашистских захватчиков и освобождения нашей Родины приказываю:

Усилить удары по врагу, всеми силами и средствами помогать наступающей Красной Армии. Взять под настоящий контроль железную дорогу Минск-Бобруйск, подрывать вражеские эшелоны, разрушать железнодорожное полотно, взрывать мосты, перебивать рельсы, обстреливать вражеские паровозы, самолеты и цистерны с горючим из ПТР и пулеметов бронебойно-зажигательными патронами.

Контролировать шоссейные дороги Березино-Червень и Бобруйск-Пуховичи. Минировать и разбирать их, взрывать и сжигать мосты, нападать на колонны противника, передвигающегося по ним.

3. Всеми силами встать на защиту мирного населения нашего района. Не давать фашистам грабить и жечь наши села, убивать и угонять на каторгу наших людей. Стойко защищать свои деревни, не давать противнику возможности безнаказанно врываться в них. Помогать населению создавать продовольственные базы и убежища в лесах, прививать ему навыки разведки и элементарной организованности, предупреждать его при наступлении превосходящих сил противника [...]

Секретарь Осиповичского подпольного РК КП(б)Б Войтенков

.Командир военно-оперативной группы при Осиповичском подпольном РК КП(б)Б генерал-майор Королев

Начальник штаба военно-оперативной группы при Осиповичском подпольном РК КП(б)Б капитан Нехай

НАРЫ Ф. 1406. оп. 1. Д. 346. Л. 124-128. Заверенная копия.